

ТВОЙ САБАКА – ТВАЯ ПРАБЛЕМА? МС

ЯК ЗМАГАЦЦА З СУМНІКАМ КАНАДСКІМ? МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ВЕРАСНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 169 (29036)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Атрымаўшы базавую адукацыю, абавязковую для ўсіх, падлетак сёння не можа выйсці ў самастойнае жыццё. Яшчэ ўзрост не дазваляе. Па прычыне ўзроставых абмежаванняў ён не можа атрымаць паўнавартасную работу, таму мы ў новым Кодэксе аб адукацыі заклалі пераход на абавязковую агульную сярэднюю адукацыю. Для гэтага нам практычна ніякіх намаганняў прыкладаць не трэба. Яна ўжо фактычна пачала рэалізоўвацца, мы дэ-юрэ зацвердзім тое, што дэ-факта існуе».*

# БУЛЬБА ЎРАДЗІЛА!



Фота БелТА.

У гаспадарцы «Світанак» імя К. Арлоўскага Кіраўскага раёна пачалі масавую ўборку бульбы. Другі хлеб, які займае тут 300 гектараў, сёлета надзвычай добры — ураджайнасць складае больш за 400 цэнтнераў з гектара. *На здымку:* механізатар Валерый ПІСКУНОЎ і памочнік Уладзіслаў ЧАБАН.

## КОРАТКА

- **«Беларуськалій» да 2025 года павялічыць вытворчыя магутнасці па выпуску ўгнаенняў да 15,5 млн тон штогод.**



- У краіне будзе створана рэгіянальная сетка крызісных псіхолагаў, да якіх людзі змогуць звяртацца непасрэдна на месцах.
- **У Беларусі закладваюцца плантацыі фундуку і грэцкага арэха для наступнага вывучэння ў прамысловых умовах.**
- На Мінскім паўмарафоне, які пройдзе 15 верасня, будзе працаваць адна тысяча валанцёраў.

Брэст 1000 год!

# ГОРАД, ЯКІ ЛЮБІЦЬ НАС І ЯКІ ЛЮБІМ МЫ

### Кожнаму ў Брэсце сёння ёсць што сказаць малой радзіме

**Сёння наш горад пачынае сваё грандыёзнае святкаванне. Як быццам, ёсць нагода. Усё-такі 1000-гадовы юбілей адзначаем. Другі такі праз 10 вякоў наступіць. Ці будзе на гэтым месцы нейкае пасяленне, і якім яно будзе, дакладна не скажа ніхто. А зараз у Брэсце жывуць людзі, іх 350 тысяч чалавек. Большасць з іх, несумненна, любяць свой горад, хочуць, каб ён квітнеў і развіваўся.**

З многімі давялося гаварыць апошнім часам пра тысячагоддзе. Пра будучы юбілей у нас сталі згадваць не ўчора, а нашмат раней. Гэта актыўная падрыхтоўка ішла ў апошнія гады, маецца на ўвазе ўзвядзенне і рамонт розных аб'ектаў, шматпланавае добраўпарадкаванне. А ў культурніцкім асяродку тэма міленіума ўзнікала даўно, ідэі выспявалі загадзя. Многія з тых ідэй знайшлі сваё ўвасабленне ў праграме святкаванняў, таму і выглядае названая праграма вельмі цікава.

Яшчэ некалькі гадоў таму, на адной з навуковых канферэнцый, прысвечаных Берасцейскім кнігазборам, тагачасны намеснік дырэктара па навуковай рабоце Брэсцкай абласной бібліятэкі **Ала МЯСНЯНКІНА** нагадала аўдыторыі, што 1000-гадовая гісторыя ўвасобленая не ў сценах і мурах, тым больш што іх тут фактычна не засталося, а ў дакументах, у пісьмовых і друкаваных помніках. Сапраўды, спачатку было слова. Інакш хто б даведаўся, калі той Брэст узнік.

СТАР. 4

Жыллё

# СМАЛЯВІЧЫ І РУДЗЕНСК — У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

### Менавіта тут будзе актыўна весціся будаўніцтва кватэр для мінчан



Фота БелТА.

**Ні для кога не сакрэт, што тэрыторыі, якія знаходзяцца блізка ад індустрыяльнага парка «Вялікі камень», лічацца найбольш ліквіднымі. Перспектыва атрымаць жыллё (а ў далейшым і работу) у такім індустрыяльным месцы здаецца досыць павабнай. І нядзіўна, што на першы эксперыментальны дом у Смалявічах, а дакладней на 192 кватэры ў гэтым доме, прэтэндуе паўтары тысячы чалавек.**

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X
19169>
9 771990 763008